Віталь Пятроўскі

# Вавёрчыныя хронікі

Мінск
«Колорград»
2022

УДК 821.161.3-93
ББК 84(4Беи)-44
П99

*Для дзяцей малодшага школьнага ўзросту*

**Пятроўскі, В.**

П99 Вавёрчыныя хронікі / Віталь Пятроўскі. – Мінск : Колорград, 2022. – 73 с. : іл.

ISBN 978-985-896-193-0.

«Вавёрчыныя хронікі» – кніга, якая распавядае аб незвычайных вандроўках чылійскіх кустарнікавых вавёрак-дэгу, якія жылі сабе ў звычайных гаспадароў у адным з беларускіх гарадоў. Але ж гэтага ім было мала. Таму вырашылі яны аднойчы…

Прыгоды і таямніцы, сяброўства і першае каханне, а яшчэ шмат неверагоднага і цікавага адбывалася з братамі-дэгу. І ўсё гэта – на старонках кнігі «Вавёрчыныя хронікі».

**УДК 821.161.3-93**
**ББК 84(4Беи)-44**

**ISBN 978-985-896-193-0**

© Пятроўскі В., 2022
© Пятроўскі В., ілюстрацыі, 2022
© Афармленне. ТАА «Колорград», 2022

*Прысвячаецца маім дзецям –*

*Цімафею, Мацвею і Ганне.*

# ВАВЁРЧЫНЫЯ ХРОНІКІ

## Глава 1

Першы дзень ўцекачоў прайшоў даволі ціха і без прыгодаў. Раптам знойдзенае дупло ў ствале акацыі схавала на ўсю ноч абодвух братоў-дэгу, а іголкі на галінках дрэва абаранялі ад выпадковых атак варон ды іншых нежаданых гасцей.

Вецярок дзьмуў праз скрыжаваныя галінкі дрэва, і здавалася, што яны сядзяць і прымаюць паветраны душ. Бо напор паветраных струяў быў дзесьці слабейшы, дзесьці мацнейшы, дзякуючы галінкам.

– Гэта добра, што нас пахавалі не вельмі глыбока, – казаў, парушыўшы маўчанне, Кэнат. Ён быў старэйшы за свайго брата Сквірэла на паўгадзіны і таму разважаў заўсёды вельмі сур’ёзна.

– Так, а я амаль тыдзень змагаўся з хваробай і памёр услед за табой, – адказаў Сквірэл, – калі мяне хавалі, я ведаў, што ты ўжо дзесьці непадалёку назіраеш за нашымі гаспадарамі, якія

неслі мяне да бабровага возера хаваць побач з табой.

Але ведаеш, было крыху страшна прагрызаць каробку ад трубкі для палення і пракопвацца ўверх праз зямлю.

– Дзякуй гаспадарам, магілы нашы атрымаліся не вельмі глыбокімі, таму мы хутка прагрызлі труны і збеглі.

Дэгу – цудоўныя капацелі, не такія выдатныя, як краты, але ж на сваёй радзіме ў Чылі яны рояць норы і ў іх будуюць свае гнёзды.

Боль у шыях братоў-дэгу яшчэ дакучала ім пасля вялікай колькасці ін’екцый, якімі іх шчодра калолі дактары-ветэрынары.

Потым усё скончылася, браты памерлі адзін за адным.

Насамрэч яны былі вельмі крэатыўнымі чылійскімі вавёркамі-дэгу, і ўсю гэтую гульню ў смерць і пахаванне падрыхтавалі.

Уздоўж берага бабровага возера гулялі людзі з какаючымі сабакамі, гулялі какаючыя сабакі без людзей і калі-некалі какаючыя людзі без сабак.

# Вавёрчыныя хронікі

Усё навокал рухалася, какала, кашляла, смаркалася, карацей кажучы – жыло. Але трэба было накіроўвацца далей у бліжэйшы гарадскі парк, дзе вавёрак-дэгу абавязкова сустрэнуць і абдымуць звычайныя вавёркі. Хаця пакуль і ўвогуле ніхто з паркавых вавёрак не ведаў нават пра існаванне братоў.

– Трэба дабірацца ўначы, пакуль горад спіць. Лятучым мышам мы не цікавыя, а вялікія птушкі спяць у гэты час, – разважаў Кэнат.

Ён, як мы ўжо казалі, быў старэйшы за Сквірэла. Нават памеры яго дэгусінага тулава былі крыху большымі.

– Згодны, але ж мы павінны спаць уначы, як усе нашыя сародзічы, – адказаў Сквірэл, пазяхаючы.

Гаспадары набылі іх больш як год таму і далі абодвум братам дзіўныя, на вавёрчын погляд, імёны. Гэта пастараўся старэйшы з дзяцей у сям'і гаспадароў.

Зярняткі акацыі, трошкі кары з галінак яблыні, якая стаяла побач, гэта быў амаль адзіны варыянт без варыянтаў вавёрчынай вячэры. Гэта ж самае еў Кэнат, пакуль чакаў на дрэвах пахавання свайго брата.